ШКОЛЫ МІРУ 3

ЧАМУ ВАРТА СЦЕРАГЧЫСЯ ІНТЭРНЭТУ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

13 СТУДЗЕНЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 7 (29887)

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:

«У Беларусі створаны сур'ёзныя сістэмныя ўмовы ў сферы развіцця педагагічнай адукацыі. Выбудавана сістэма бесперапыннай педадукацыі, пачынаючы з педагагічных класаў, якія даволі паспяхова працуюць ужо больш за пяць гадоў. Безумоўна, гэта і ўзровень устаноў сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, і падрыхтоўка кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі — аспірантура, дактарантура. Ёсць яшчэ адна сур'ёзная і важная задача, якая стаіць сёння перад педагогамі, — выкарыстанне адукацыйнага патэнцыялу ў галіне выхавання моладзі. Мы выдатна разумеем, што асабліва цяпер выхаваўчы патэнцыял педагога павінен быць задзейнічаны як ніколі».

Выпрабавальны палёт

Днямі ў Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку адбылося ўрачыстае адкрыццё першай агульнаадукацыйнай змены ў 2023 годзе. Навучэнцамі студзеньскай змены сталі сто пяцьдзясят школьнікаў, якія прыехалі ў Мінск з усіх куткоў краіны, адораныя дзеці, матываваныя ў паглыбленым вывучэнні абранага імі напрамку ведаў.

Навучанне арганізавана па 15 напрамках. Дзесяцікласніцы сярэдняй школы № 3 горада Беразіно Раман БЛІЗНЮК і вучаніца 10 класа 3-й гімназіі Віцебска Марыя ІСАЕНКАВА абралі для вывучэння спецыялізацыю «Авіякасмічныя тэхналогіі».

Віктар ІВАНЧЫКАЎ, фота аўтара.

КАРАТКА

- **Беларусь упершыню дасягнула дадатнага сальда ў гандлі з Расіяй.**
- Міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў 19 студзеня наведае з візітам Беларусь.
- **Аддзяленне дзённага знаходжання адкрылася ў РНПЦ псіхічнага здароўя.**
- БелАЗ паставіў шэсць 220-тонных самазвалаў у Кузбас.
- **Мінгарвыканкам пачаў адбор прэтэндэнтаў для занясення на рэспубліканскую Дошку гонару. Заяўкі прымаюцца да 15 лютага ўключна.**
- Урад КНР выдзеліць 350 млн юаняў для будаўніцтва басейна і стадыёна ў Мінску.

ISSN 1990 — 763X

На слыху

ПРАВЕРЦЕ СВОЙ АРГАНІЗМ

Ці абавязковая дыспансерызацыя і як яе прайсці?

Дыспансерызацыя — комплекс мерапрыемстваў, які ўключае ў сябе прафілактычны медыцынскі агляд і дадатковыя метады абследаванняў, якія праводзяцца для ацэнкі стану здароўя. Сёлета ў нашай краіне змяніўся яе парадак, і многіх палохае непазбежнасць гэтай працэдуры. Але ці абавязковая яна для ўсіх? Якія захворванні дапамагае выявіць? Як цяпер прайсці дыспансерызацыю і колькі часу яна зойме? Усе новаўвядзенні растлумачыла галоўны ўрач 11-й гарадской паліклінікі Мінска Ірына БОЛДЫРАВА.

— Ірына Мікалаеўна, з пачатку гэтага года змяніўся парадак дыспансерызацыі. Што канкрэтна абнавілася?

— З 1 студзеня 2023 года ўступіла ў сілу пастанова Міністэрства аховы здароўя ад 9 жніўня 2022 года № 83 «Аб зацвярджэнні інструкцыі аб парадку правядзення дыспансерызацыі дарослага і дзіцячага насельніцтва». Яна і вызначае парадак яе правядзення.

СТАР. 4

Спажывец

ГРОШЫ Ў «РАЗРЭЗЕ»

Сакрэтамі сваёй работы з фальшывымі купюрамі дзеляцца эксперты-крыміналісты

У Гродне ў сярэднім кожны тыдзень выяўляюць падроблены грашовы банкнот. Бывае, што адрозніць фальшыўку ад сапраўдных купюр даволі складана, бо тэхніка іх выканання ўдасканальваецца. І ўсё ж улічыць усе сапраўдныя ступені абароны грошай немагчыма. Спецыяльная тэхніка судовых экспертаў абавязкова выявіць падробку. Дарэчы, гэта даступна і нам, калі ведаць некаторыя тонкасці. Пра іх якраз і расказаў старшы эксперт Гродзенскага міжраённага аддзела ДКСЭ Антон ГАНЕНКА.

СТАР. 4

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«РАЗМОВА АБ ТЫМ, ШТО БЕЛАРУСЬ І РАСІЯ АДМАЙЛЯЮЦЦА АД СВАЙГО СУВЕРЭНІТЭТУ, ІСЦІ НЕ МОЖА»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях выканання інтэграцыйных праграм Саюзнай дзяржавы

Дваццаць восем галіновых праграм былі прыняты 4 лістапада 2021 года на Вышэйшым дзяржаўным савеце Саюзнай дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка нагадаў: падчас прыняцця праграм беларускі і расійскі бок дамовіліся, што іх рэалізацыя дасць магчымасць істотна прайсці наперад на шляху забеспячэння роўных правоў грамадзян і суб'ектаў гаспадарання дзвюх краін. «Гэта аснова, на якой мы будуем адносіны з брацкай Расіяй, — роўныя ўмовы для людзей і прадпрыемстваў. Менавіта таму мы пайшлі на комплексныя рашэнні шматлікіх пытанняў супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй», — сказаў Прэзідэнт.

Перш за ўсё, па словах кіраўніка дзяржавы, гэта датычыцца інтэграцыі ў эканамічнай сферы, падмурка стварэння ўмоў для кааперацыі прадпрыемстваў абедзвюх краін. У праграмах і ведамасных планах змяшчаецца каля тысячы мерапрыемстваў па іх рэалізацыі, устаноўлены канкрэтныя тэрміны і адказныя асобы. Але, звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, нягледзячы на выкананне большасці мерапрыемстваў, заўважных зрухаў у сферах энергетыкі, прамысловасці, транспарту Рэспубліка Беларусь пакуль не адчула.

«Выкананне праграм па фарміраванні аб'яднаных рынкаў газу, нафты і нафтапрадуктаў запатрабавала вынясення пытання на вышэйшы ўзровень. У ходзе снежаньскіх перагавораў з Прэзідэнтам Расіі необходныя развязкі былі знойдзены. Як мінімум на тры гады. Цяпер ідзе работа над замацаваннем — дасягнутых дамоўленасцяў у адпаведных дакументах», — адзначыў ён.

«Гаворка не ідзе аб страце суверэнітэту»

Адзін з важных напрамкаў — гарманізацыя падатковага заканадаўства. «Гэта натуральна, калі мы патрабуем ад Расіі роўных умоў і іншае. Натуральна з гэтага выцякае гарманізацыя нашых падаткаў, якія выплачваюць суб'екты гаспадарання і людзі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Гаворачы аб каардынацыі падатковага і мытнага кантролю на граніцах Саюзнай дзяржавы, Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што ўсё павінна быць празрыста: «Расіяне тут абсалютна не супраць, каб у любы пункт беларускія прадстаўнікі, як і яны, прыехалі і паглядзелі, чым дыхае граніца. Адсочванне тавараў, кантроль за рухам тавараў, пагадзіцеся, важныя для любой дзяржавы».

У рамках такой работы ўнесена прапанова ад ратыфікацыі Дагавора аб агульных прынцыпах падаткаабкладання па ўскосных падатках. Але, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, перш чым яго падпісаць, трэба яшчэ раз вярнуцца да пытанняў, якія ўзнікаюць з падатковым і мытным заканадаўстам, пачуць, ці ўсе нашы інтарэсы і прапановы ў ім улічаны. Перш за ўсё, з беларускага боку.

Прэзідэнт акцэнтаваў увагу, што пры гэтым размова не ідзе аб страце нейкай часткі нашага суверэнітэту. «Як устанаўліваліся падаткі і законы прымаліся раней у Беларусі, так і будуць прымацца. Тым больш у гэтым плане мы ўжо Падатковы кодэкс адпрацавалі, ён дзейнічае. Што да канкрэтных падаткаў, натуральна, сітуацыя будзе ў руху і падаткі гэтыя будуць павялічвацца ці змяншацца, што адбывалася штогод. Мы незалежныя ў прыняцці рашэнняў у гэтай значнай сферы, мяркуецца толькі больш цесная каардынацыя дзейнасці з расійскімі калегамі», — растлумачыў ён. Аналагічныя падыходы і ў мытнай сферы.

«Спешкі быць не павінна»

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, вядома, эканамічная інтэграцыя з Расіяй будзе паглыбляцца. Але пра новы пакет інтэграцыйных дакументаў можна будзе казаць толькі пасля выканання папярэдняга ў поўным аб'ёме. «Не выканалі хоць адзін пункт — ні аб якім новым пакеце інтэграцыйных дакументаў размовы быць не можа. Аб гэтым мы цвёрда дамовіліся з Прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі на апошняй сустрэчы ў Санкт-Пецярбургу», — падкрэсліў ён.

Прэзідэнт арыентуе на неабходнасць максімальна актывізаваць дзейнасць па рэалізацыі саюзных праграм. Недапушчальныя зацягванне і маруднасць у прыняцці рашэнняў. Але і спешкі быць не павінна. Па яго словах, калі будзе знойдзена памылка, адвярнуць сітуацыю будзе немагчыма пасля таго, як тыя рашэнні будуць замацаваны ў заканадаўстве дзвюх краін. «Асабліва цяпер, калі нашы краіны разам супрацьстаяць ашалеламу санкцыйнаму ціску гэтага так званага калектыўнага Захаду», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што выкананне інтэграцыйных праграм Саюзнай дзяржавы — гэта пытанне эканомікі і адказнасць двух урадаў, двух прэм'ер-міністраў. «Усе пытанні, якія вы выносілі на ўзроўні прэзідэнтаў, вырашаны, развязкі знойдзены, жывём у нармальных умовах», — адзначыў ён. Па словах кіраўніка дзяржавы, расійскі бок пайшоў насустрач усім просьбам беларускіх калег.

«Размова аб тым, што Беларусь і Расія адмаўляюцца ад свайго суверэнітэту, не ішла і на сёння не ідзе і ісці не можа. Проста няма неабходнасці ў гэтым. Мы яшчэ ў тым фармаце, у якім супрацоўнічаем з Расіяй, не выпрацаваліся. Калі ўбачым, што нечага не хапае, трэба прымаць дадатковыя рашэнні ў плане інтэграцыі, збліжэння эканомік дзяржаў, тады мы на гэта пойдзем», — канстатаваў Прэзідэнт.

«Трэба дзейнічаць ад жыцця»

Кіраўнік дзяржавы таксама расказаў, што прыняцце Саюзных праграм не было раптоўным. Іх актыўна абмяркоўвалі службовыя адказныя асобы на Вышэйшым дзяржаўным савеце. «Іскрыла вельмі, калі мы гэтыя праграмы прымалі, іх былі дзясяткі. Мы пайшлі разам з расіянамі, дамовіўшыся на 28 міжгалінавых праграм. Былі прапановы і парламент стварыць, і яшчэ нешта там стварыць, і гэтак далей і да таго падобнае. Усё гэта было не прынята», — расказаў ён. Па словах беларускага лідара, час падштурхнуў прыняць гэтыя 28 праграм сацыяльна-эканамічнага характару.

Прэм'ер-міністр у сваім дакладзе адзначыў: сёння можна казаць пра тое, што час пацвердзіў правільнасць абранага курсу. Нягледзячы на сур'ёзныя выклікі, санкцыі і гэтак далей, Беларусь і Расія развіваюць супрацоўніцтва ў сацыяльна-эканамічнай сферы і дабіваюцца тут вынікаў. Па выніках 11 месяцаў 2022 года дасягнуты гістарычны максімальны аб'ём узаемнага абароту тавараў і паслуг — 45 мільёнаў долараў. Раман Галоўчанка далажыў, што ўпершыню для Беларусі ў гандлі з Расіяй складваецца дадатнае сальда — гэта значыць, вартасны экспарт тавараў і паслуг перавышае імпарт. У цэлым жа па выніках мінулага года беларускі экспарт тавараў на расійскі рынак вырас як у фізічным, так і ў коштавым выражэнні. Звычайна адной з асноўных праблем у гандлі тавараў і паслуг з Расіяй было адмоўнае сальда. Раман Галоўчанка растлумачыў: гэта значыць, беларусы там купілі больш, чым прадавалі. У некаторыя гады развежка даходзіла да 7 мільярдаў долараў.

«Работа з кожным рэгіёнам Расіі стаіць на асаблівым кантролі ў тым ліку ў Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Расіі. Сістэма адбудавана, і я ўпэўнены, што сёлета яна будзе працаваць сапраўды гэтак жа», — адзначыў Раман Галоўчанка.

❍ У тэму

КУРС НА ІНТЭГРАЦЫЮ БЫЎ АБРАНЫ ПРАВІЛЬНЫ

Пасля нарады ў размове з журналістамі прэм'ер-міністр заявіў, што ўзяты раней курс на інтэграцыю з Расіяй і рэалізацыю саюзных праграм быў выбраны правільна і своечасова. Ён нагадаў, што ў свой час праграмы абмяркоўваліся і прымаліся некалькі ў іншай геапалітычнай абстаноўцы. «Я не думаю, што гэта супадзенне, — што мы выбралі менавіта такі курс, узялі такі напрамак, які цяпер прыносіць нам пэўныя эканамічныя дывідэнды. Гэта было свядомае рашэнне, якое зацвердзілі кіраўнікі дзвюх дзяржаў. Абазначылі траекторыю руху, задачы, якія стаяць перад тымі дзяржаўнымі органамі, якія рэалізоўваюць саюзныя праграмы. Ва ўрадзе мы адзіныя ў меркаванні, што праграмы працуюць на карысць Беларусі», — падкрэсліў Раман Галоўчанка. Пры гэтым, па яго словах, пры рэалізацыі саюзных праграм Беларусь не страціла ні грама суверэнітэту, па-ранейшаму абсалютна самастойна прымае на нацыянальным узроўні рашэнні ў сацыяльна-эканамічнай сферы.

У частцы рэалізацыі саюзных праграм абедзве краіны, паводле слоў прэм'ер-міністра, прасоўваюцца нядрэнна. «Больш марудна ідзе работа па так званых энергетычных праграмах (мы першапачаткова гэта ведалі і былі гатовы). І галоўнае пытанне тут — у асноўных інстытуцыйных падыходах да таго, як павінны функцыянаваць аб'яднаны рынкі газу і нафты. Мы цяпер гаворым аб нейкай сістэме, якая будзе працаваць у далейшым і не будзе патрабаваць, дапусцім, штогадовага або кожныя тры гады ўдакладнення нейкіх параметраў», — растлумачыў Раман Галоўчанка. Прэм'ер-міністр нагадаў, што работа над саюзнымі праграмамі ў частцы падаткаабкладання і мытнага рэгулявання таксама ішла няпроста, але ў выніку яны рэалізаваны. Таксама будзе і з энергетычнымі праграмамі.

«Мы ўсё роўна завершым гэту работу. Яна не вельмі простая. Хоць работа па падатковых і мытных картах таксама была складаная. Калі мы да яе прыступалі, то пытанняў і невыразнасцяў было значна больш, чым адказаў. Але на сёння можна канстатаваць: дагавор па ўскосных падатках падпісаны, сёння аб гэтым падрабязна даложана кіраўніку дзяржавы, у тым ліку аб тым, што адчувальныя фінансавыя вынікі атрымала Беларусь ад рэалізацыі мерапрыемстваў, закладзеных у гэты дагавор», — сказаў Раман Галоўчанка.

Блізкая ўлада

Наталля КАЧАНАВА:

«У рабоце са зваротамі грамадзян не павінна быць фармалізму»

Пад кіраўніцтвам Наталлі Качанавай 12 студзеня адбылося выязное пашыранае пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі, падчас якога былі абмеркаваны вынікі работы са зваротамі грамадзян і юрыдычнымі асобамі ў сталіцы за 2022 год.

— Пытанне, якое мы вынеслі да разгляду, для нас не новае, — звярнулася да ўдзельнікаў сустрэчы Старшыня Савета Рэспублікі. — Вы ведаеце, што рэгламент нашай работы прадугледжвае штомесячныя прыёмы грамадзян. Але ў вырашэнні гэтых пытанняў мы пайшлі далей і цяпер штоквартальна праводзім адзіны дзень прыёму ў розных рэгіёнах нашай краіны. Каб даведацца аб рэальнай сітуацыі і аб тым, як выбудавана работа з грамадзянамі на месцах, 11 студзеня мы правялі адзіны дзень прыёму грамадзян у Мінску, ва ўсіх адміністрацыях горада.

Наталля Качанава адзначыла:

— Я ўпэўнена, што тая работа з грамадскімі зваротамі, якая выбудавана ў нашай краіне, сістэмная, грунтоўная, і тыя патрабаванні, якія прад'яўляюцца да кіраўнікоў усіх узроўняў па рабоце са зваротамі грамадзян, абсалютна дакладныя і зразумелыя для ўсіх.

Старшыня Савета Рэспублікі нагадала, што ў 2021 годзе пад кіраўніцтвам Прэзідэнта адбыўся Рэспубліканскі семінар, падчас якога былі разгледжаны пытанні работы са зваротамі грамадзян:

— Была акцэнтавана ўвага на неабходнасці там, дзе трэба, удасканаліць гэтую работу, а таксама на неабходнасці работы з кожным чалавекам, куды б ён ні звяртаўся, і аператыўнага вырашэння пытанняў. І, самае галоўнае, — наяўнасць магчымасці трапіць на прыём да службовых асоб, якія па абавязку сваёй службы павінны займацца гэтымі пытаннямі. Нягледзячы на тое што мы ўжо шмат гадоў працуем у адпаведнасці з законам па гэтай тэматыцы, бачым, што яна не страчвае сваёй актуальнасці. Сапраўды, пытанні, якія хвалююць нашых грамадзян, былі, ёсць і будуць — гэта жыццё. Мы сацыяльна арыентаваная дзяржава, самае галоўнае для нас — чалавек, з усімі яго магчымасцямі, жаданнямі, пытаннямі. Тое, як выбудавана наша работа, мы можам даведацца толькі падчас непасрэднага кантакту з людзьмі, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што ў Мінску работа са зваротамі грамадзян выбудавана на сістэмнай аснове: праводзіцца дастаткова шмат рэгулярных прыёмаў ва ўстаноўленыя тэрміны.

— Але трэба звяртаць увагу на якасць работы, якая праводзіцца. На тое, наколькі хутка і аператыўна вырашаюцца пытанні, якія задаюць нам людзі. Гэта вельмі важна. І ў гэтай рабоце не павінна быць фармалізму. Трэба ўважліва слухаць людзей.

Асноўнымі тэмамі зваротаў, з якімі грамадзяне прыходзілі падчас адзінага дня прыёму ў Мінску, сталі пытанні ЖКГ, аховы здароўя і будаўніцтва жылля. Больш падрабязна аб выніках, якія былі падведзены падчас выязнога пашыранага пасяджэння Прэзідыума Савета Рэспублікі, чытайце ў наступным нумары «Мясцовага самакіравання».

Арына КАРПОВІЧ.

ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 14 студзеня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў, член Савета Рэспублікі Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатольевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;

• намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч КРУЧАНАЎ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Надзея Анатольеўна ЛАЗАРЭВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Адукацыйны праект

Ідэі міру — у сэрцы дзяцей

На Брэстчыне адзінаццаць школ маюць ганаровы статус «Школ міру»

Гэты год, як вядома, аб'яўлены Годам міру і стварэння, таму асаблівае гучанне набываюць адукацыйныя праекты, якія накіраваны на ўмацаванне ідэй міру і стваральнай працы. Канцэпцыя «Школы міру» сюды як найлепей падыходзіць. Праект ажыццяўляецца грамадскім аб'яднаннем «Беларускі фонд міру» пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Прадстаўніцтва ААН у Беларусі. На пачатак года ў Брэсцкай вобласці ўдзельнікамі праекта былі 11 установ адукацыі.

Намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім КРАЎЧУК у размове з журналістамі акцэнтаваў увагу на ролі праекта ў справе духоўнага і патрыятычнага выхавання дзяцей: «Са школьных гадоў чалавек фарміруецца як асоба, закладваюцца такія якасці, як міласэрнасць, спагада, гатоўнасць да ўзаемадапамогі. Прыемна, што вучні актыўна ўключыліся ў работу, напаўняюць практыку цікавым зместам. Гэта інавацыйная і даволі паспяховая форма пазакласнай работы. Упэўнены, што сёлета ганаровы статус «Школы міру» атрымаюць яшчэ некалькі ўстаноў адукацыі».

Вялікую работу па захаванні гістарычнай памяці, папулярызацыі гістарычных ведаў, а таксама традыцый нашага народа праводзяць у Пінкавіцкай школе Пінскага раёна. Цікавыя праекты рэалізавалі Жарабковіцкая школа Ляхавіцкага раёна і сярэдняя школа ў Старым Сяле Жабінкаўскага раёна. У Маларыцкім раёне, акрамя сярэдняй агульнаадукацыйнай школы ў Макранах, такі статус атрымаў і дзіцячы дом сямейнага тыпу ў Маларыце. Дзве школы ў Кобрынскім раёне — у Кісялёўцах і Астромічах, як і сярэдняя школа ў Ганцавічах, з гонарам называюць сябе міратворцамі. Як адзначыла **старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення ГА «Беларускі фонд міру» Лідзія РАМАНЮК**, такі праект не нараджаецца на пустым месцы: «На званне «Школ міру» могуць прэтэндаваць такія ўстановы адукацыі, дзе ёсць багатыя традыцыі ў пошукавай рабоце, дзе працуюць музеі, гурткі гістарычнай і патрыятычнай накіраванасці, робяцца добрыя справы, развіты валанцёрскі рух». Не так даўно да пералічаных вышэй далучылася Махроўская сярэдняя школа Іванаўскага раёна. У ёй размешчаны добры гісторыка-краязнаўчы музей. Пад кіраўніцтвам педагогаў дзеці займаюцца пошукавай работай не адно дзесяцігоддзе. І гадоў з восем таму юныя пошукавікі вырашылі заняцца аднаўленнем дыслакацыі Пінскай партызанскай брыгады. Мясцовая ўлада ўвесь час аказвала ім дапамогу. Вынікам работы стала аднаўленне партызанскай стаянкі ва ўрочышчы. Цяпер там праходзяць мерапрыемствы, яе маюць магчымасць наведаць турысты.

Школьнікі з Дамачава на жалобным мітынгу каля помніка расстралянаму дзіцячаму дому.

— Пінская партызанская брыгада дзейнічала ў Пінскім, Жабчыцкім, Іванаўскім раёнах, — расказаў **старшыня Махроўскага сельскага Савета Іван КУНАХАВЕЦ**. — Асноўныя сілы брыгады размяшчаліся за Дняпроўска-Бугскім каналам, штаб брыгады знаходзіўся ў Пуслоўскім лесе. Адсюль партызаны наносілі ўдары па ворагу, узрывалі эшалоны, чынілі дыверсіі ў гарадах — займаліся звычайнай баявой работай. У лютым 1944 года Пінская брыгада брала ўдзел у гераічнай абароне на рубяжы Дняпроўска-Бугскага канала. Выходзіць, што партызаны паспяхова супрацьстаялі падраздзяленням рэгулярнай арміі. Тады брыгада налічвала каля тысячы партызанаў.

Менавіта дзеці выступілі ў свой час з ініцыятывай аднавіць лагер, — працягвае кіраўнік мясцовай улады. Работа працягвалася тры гады. Спачатку тэрыторыю расчышчалі ад кустоўя, аднавілі штабную зямлянку, памалу рэстаўравалі траншэі і агнявыя пункты, вызначылі месцы, дзе знаходзіліся калодзежы. Іх было, як аказалася, восем. Пітная вада — аснова існавання базы. Падчас работы нават знайшлі кубак і газавую лямпу, цяпер гэтыя прадметы сталі экспанатамі школьнага музея.

Вядома, намаганняў дзяцей і іх настаўнікаў было недастаткова. Падключылася мясцовая ўлада. Найперш прывялі ў парадак дарогу, каб можна было праехаць нават на легкавой машыне. Пачалі шукаць спонсараў на будаўніцтва. Такія, на шчасце, знайшліся, дапамаглі фінансава. Падтрымаў ідэю і паспрыяў рабоце райвыканкам.

І цяпер штомесяц на экскурсію ў мясціны былой партызанскай брыгады прыязджае да 200 школьнікаў з розных раёнаў, а іх равеснікі з Махроўскай школы выступаюць экскурсаводамі.

Пры разглядзе дакументаў аб прысваенні статусу «Школы міру» Дамачаўскай сярэдняй школе ўлічвалі вялікую работу па захаванні звестак пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Установа шмат зрабіла і робіць па ўвекавечанні памяці аб трагедыі расстрэлу Дамачаўскага дзіцячага дома. Школьнікі даглядаюць помнікі, устаноўленыя ў гонар ахвяр, удзельнічаюць ва ўсіх памятных мерапрыемствах, прыносяць туды кветкі і запальваюць лампадкі на святы.

Першай у абласным цэнтры міратворчы статус атрымала брэсцкая гімназія № 2 за работу ў духоўным выхаванні, валанцёрскім руху, багаты і змястоўны экалагічны кірунак пазакласнай работы, клопат пра захаванне памяці.

Кожная з названых школ мае значны спіс добрых спраў, якія накіраваны на выхаванне ў юных грамадзян усведамлення міру як галоўнай каштоўнасці. Некалькі школ вобласці падалі заяўкі і чакаюць прысваення статусу ў найбліжэйшы час.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Надвор'е

ДОЖДЖ ЗНОЎ «З'ЕСЦЬ» СНЕГ

На наступным тыдні нас чакаюць чарговая адліга і галалёдзіца на дарогах

Памарозіла нас крыху і хопіць... Да канца тыдня ў нашу краіну прадоўжаць паступаць атмасферныя франты і цёплыя паветраныя масы. А таму халады з кожным днём будуць здаваць свае пазіцыі. І калі пятніца і субота яшчэ будуць даволі кантрасныя, то ўжо ў нядзелю тэмпература паветра па краіне павысіцца і будзе вагацца ад слабага мінуса да няўпэўненага плюса. Хоць плюс 6 — плюс 7 градусаў у студзені — гэта ўсё ж анамалія. На наступным тыдні будуць яшчэ туманы і мокры снег, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і манітарынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Паводле прагнозу сіноптыкаў, у першай палове наступнага тыдня ў краіне па-ранейшаму будзе захоўвацца ўплыў атмасферных франтоў і цёплых паветраных мас. У большасці — ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Пры паступленні цёплага паветра месцамі па Беларусі — туманы, у асобных раёнах чакаюцца галалёдныя з'явы.

У суботу на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах слабы туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 7 градусаў па ўсходзе да плюс 4 градусаў па захадзе краіны. Днём будзе мінус 2 — плюс 4 градусы, а ў паўднёва-заходніх раёнах — да 7 цяпла.

У нядзелю ўначы месцамі, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца ападкі (мокры снег, дождж). У асобных раёнах слабы туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Месцамі ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Уначы тэмпература паветра пазітыцца да мінус 4 — плюс 3 градусаў. Удзень слупок тэрмометра пакажа мінус 2 — плюс 4 градусы, а па паўднёвым захадзе — да 6 цяпла.

Па папярэднім прагнозе айчынных сіноптыкаў, у панядзелак на большай частцы тэрыторыі краіны будуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе вагацца ад мінус 2 да плюс 4 градусаў. Днём па паўднёвым захадзе чакаецца да 6 цяпла. У аўторак на большай частцы тэрыторыі Беларусі прагназуюцца ападкі (мокры снег, дождж). У асобных раёнах туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу будзе ў межах мінус 3 — плюс 3 градусы, удзень — мінус 1 — плюс 6 градусаў.

Па выніках снегаздымкі, на большай частцы тэрыторыі на палях адзначалася невялікае снежнае покрыва, у паўднёвых раёнах і на захадзе снег адсутнічаў. Глеба ў асноўным слабапрамерзлая, на крайнім паўднёвым захадзе, у асобных цэнтральных і паўночна-заходніх раёнах — адталая.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прэм'ер-міністр Індыі ўпэўнены, што глабальны рост у XXI стагоддзі забяспечаць краіны, якія развіваюцца

Прэм'ер-міністр Індыі Нарэндра Модзі заявіў, што рост развітых дзяржаў у новым стагоддзі замарудзіўся і глабальны эканамічны рост цяпер забяспечаць краіны, якія сталі на шлях развіцця, паведаміла ТАСС. «У XX стагоддзі развітыя краіны былі рухаючай сілай сусветнай эканомікі. Сёння большасць гэтых краін з развітой эканомікай запавольваецца. Зразумела, што ў XXI стагоддзі глабальны рост будзе адбывацца за кошт краін Поўдня. Я думаю, што, калі мы будзем працаваць разам, мы зможам сфарміраваць глабальны парадак дня», — заўважыў Модзі падчас анлайн-саміту «Голас Глабальнага Поўдня» (Глабальным Поўднем умоўна называюць краіны Афрыкі, Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна, ціхаакіянскіх астравоў, а таксама краіны Азіі, якія развіваюцца). Ён адзначыў, што ўдзельнікі сустрэчы вызначылі агульныя праблемы, якія хвалююць краіны, што сталі на шлях развіцця. У асноўным гэта недахоп рэсурсаў і рост нестабільнасці «як у прыродным, так і ў геапалітычным клімаце».

Паўднёвая Карэя можа размясціць ядзерную зброю

Прэзідэнт Паўднёвай Карэі Юн Сок Ёль дапусціў размяшчэнне ядзернай зброі на тэрыторыі краіны альбо стварэнне сваёй, калі напружаныя адносіны з КНДР яшчэ больш пагоршацца, паведаміла агенцтва Newsis. «Калі складзецца такая сітуацыя, з нашымі навуковымі тэхналогіямі мы зможам хутка, не затраціўшы шмат часу, атрымаць ядзерную зброю», — заявіў ён. Як адзначаецца, падчас даклада міністэрства абароны прэзідэнту аб планах на 2023 год Юн Сок Ёль даручыў забяспечыць такую ваенную моц, каб у выпадку нападзення адказаць «у 100- ці нават 1000-кратным памеры». Пры гэтым ён адзначыў, што цяпер «важна выбіраць рэалістычна магчымыя варыянты», і дадаў, што зараз Сеул «абмяркоўвае абмен інфармацыяй і сумеснае планаванне ў пытаннях ядзерных актываў» з ЗША. Офіс прэзідэнта пазней выступіў з рэлізам, у якім словы кіраўніка дзяржавы назвалі «тэарэтычнай пазіцыяй, якая азначае неабходнасць рашуча адказваць на ядзерную пагрозу Паўночнай Карэі».

За месяц пратэстаў у Перу загінула амаль паўсотні чалавек

Аб гэтым паведаміла агенцтва Associated Press. У краіне з сярэдзіны снежня мітынгуюць прыхільнікі экс-прэзідэнта Педра Кастыльё. Яго электарат — пераважна жыхары сельскай мясцовасці. Мітынгоўцы патрабуюць неадкладнага правядзення прэзідэнцкіх выбараў і адстаўкі Дзіны Балуартэ, якая раней была віцэ-прэзідэнтам, але пасля ўзначаліла дзяржаву. Акцыі пратэсту праходзяць у 41 правінцыі Перу, пераважна на поўдні краіны. 9 студзеня ў краіне адбыліся найбольш кровапралітныя сутыкненні — у горадзе Хуліяка на возеры Ціцікака ў сутычках загінулі 17 чалавек, а аднаго паліцэйскага спалілі жыўцом. 11 студзеня новыя сутыкненні адбыліся ў горадзе Куска, адкуль турысты ездзяць паглядзець развалiны Мачу Пікчу. Тут пратэстуючыя паспрабавалі захапіць аэрапорт. Гарадскія чыноўнікі ад аховы здароўя паведамілі, што ў сутычках пацярпелі 37 грамадзянскіх і шасцёра супрацоўнікаў паліцыі. Яшчэ адзін чалавек загінуў ад агнястрэльнага ранення.

ПРАВЕРЦЕ СВОЙ АРГАНІЗМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Калі казаць пра дарослае насельніцтва, то новаўвядзенне дапаможа нам вырашыць праблему выяўлення фактараў рызыкі развіцця неінфекцыйных хвароб, а таксама палепшыць работу па выяўленні захворванняў на ранніх стадыях. А таксама актывізуе работу па медыцынскім назіранні ў амбулаторных умовах для пацыентаў з хранічнымі захворваннямі.

Калі раней гэта была вялікая колькасць даследаванняў, то цяпер дыспансерызацыя — мерапрыемства, накіраванае на медыцынскую прафілактыку. А пытанні па медыцынскім назіранні аднесены да клінічных пратаколаў. І, адпаведна, медыцынскае назіранне пацыентаў з хранічнымі захворваннямі будзе ажыццяўляцца па канкрэтных мерапрыемствах. Гэта будуць пэўныя даследаванні пры тым ці іншым хранічным захворванні.

Мы мусім забяспечыць даступнасць правядзення дыспансерызацыі, у тым ліку на працягу ўсяго часу работы паліклінікі. Апроч таго, наша задача — у аналізе эфектыўнасці дыспансерызацыі, а таксама ў актыўнай інфармацыйнай рабоце як сярод работнікаў, так і сярод насельніцтва.

— Якая розніца паміж дыспансерызацыяй і абавязковымі медыцынскімі аглядамі? Даводзіцца чуць меркаванне, што гэта дубліруючыя працэдуры...

— Абавязковыя медыцынскія агляды праводзяцца ў рамках закона «Аб ахове працы». Гэта медыцынскія агляды пры паступленні на работу (папярэднія), тыя, што праводзяцца падчас работы (перыядычныя), і пазачарговыя — пры пагаршэнні стану здароўя работніка.

Медагляд, па сутнасці гэта допуск да работ у шкодных і небяспечных умовах працы. Яны вызначаюцца па выніках атэстацыі ці комплекснай гігіенічнай ацэнкі рабочага месца. А дыспансерызацыя праводзіцца для ўсіх. Такім чынам, пры яе правядзенні ажыццяўляецца не прафілактычны альбо абавязковы медыцынскі агляд, а медыцынскі агляд пацыента, накіраваны на прафілактыку і выяўленне фактараў рызыкі развіцця неінфекцыйных захворванняў, у тым ліку на ранніх стадыях.

— Як часта давядзецца праходзіць дыспансерызацыю?

— Ёсць дзве групы дыспансернага назірання. Першая — 18-39 гадоў, яны праходзяць дыспансерызацыю раз на тры гады. Другая група — 40 гадоў і старэйшыя, для іх дыспансерызацыя праводзіцца штогод. Як паказвае практыка, людзі пасля 40 гадоў больш часта звяртаюцца ў паліклініку, чым у маладым узросце.

— Што дапамагае выявіць дыспансерызацыя? Ці могуць знайсці рак, пераддыябет ці дыябет і іншыя цяжкія захворванні?

— Асноўным новаўвядзеннем падчас дыспансерызацыі стане анкетаванне дарослага насельніцтва незалежна ад узросту. І па яго выніках мы выяўляем фактары рызыкі чатырох груп асноўных неінфекцыйных хвароб. Гэта хваробы сістэмы кровазвароту, цукровы дыябет другога тыпу, хранічныя абструкцыйныя хваробы лёгкіх і анкалагічныя захворванні.

— Якія працэдуры і аналізы абавязковыя? Колькі кабінетаў давядзецца наведаць?

— Пацыент прыходзіць у адзін кабінет. Тут жа яму праводзіцца анкетаванне, вымяраюць рост, вагу, аглядаюць стан поласці рота і скуры, вымяраюць акружнасць таліі, вызначаюць індэкс масы цела, вымяраюць артэрыяльны ціск. У выпадку неабходнасці выконваюць кардыяграму, а пацыентам, якія старэйшыя за 40 гадоў, вымяраюць унутрывочны ціск. На гэтым усе інструментальныя працэдуры скончаны. Па іх выніках і па ацэнцы анкетавання медыцынскі работнік вызначае далейшыя неабходныя мерапрыемствы.

Калі неабходна здаць аналізы, пацыент тут жа накіроўваецца ў працэдурны кабінет, у яго бяруць аналіз крыві праз адзін пракол — агульны, на глюкозу, пры неабходнасці — на халестэрын і ў мужчын — на вызначэнне прастатспецыфічнага антыгена. Пры неабходнасці ён здае аналіз мачы. Жанчын таксама накіроўваюць у аглядавы кабінет, ён працуе з 8 да 20 гадзін. І тут жа пацыент робіць флюараграфію, якую можна прайсці ў любы час з 8 да 20 гадзін.

У схеме дыспансерызацыі дарослага насельніцтва маецца і такая працэдура, як мамаграфія. Яна праводзіцца жанчынам ва ўзросце 50-69 гадоў, адзін раз на два гады. У адпаведнасці з гэтым мы арганізавалі работу наступным чынам: усіх жанчын дадзенай узроставай групы раздзялілі на два гады і склалі план такім чынам, каб штомесячна іх у планавым парадку абследаваць. За два гады яны ўсе пройдуць такое абследаванне.

— Куды трэба звяртацца, каб прайсці дыспансерызацыю?

— Раскажу на прыкладзе нашай установы. Дыспансерызацыя праводзіцца па папярэднім запісе. Таксама пры самастойным звароце пацыента ва ўстанову для праходжання дыспансерызацыі, у тым ліку калі ён звяртаецца ў паліклініку па запрашэнні медыцынскіх работнікаў. Таксама дыспансерызацыя ажыццяўляецца пры аказанні медыцынскай дапамогі — калі пацыент прыйшоў па сваіх пытаннях на прыём да ўрача, яму ў гэты ж дзень будзе праведзена дыспансерызацыя ў поўным аб'ёме.

Хачу звярнуць увагу, што папярэдні запіс для правядзення дыспансерызацыі ажыццяўляецца на працягу усяго часу работы паліклінікі. І калі пацыент сам звяртаецца ў рэгістратуру ці стол даведак, ён можа запісацца, у тым ліку патэлефанаваць па мабільным ці стацыянарным тэлефоне. Акрамя таго, запісацца можна праз інтэрнэт на сэрвісе talon.by. Таксама праз сайт медыцынскай установы, на якім створана спецыяльная электронная пошта. Туды пацыент заходзіць, пакідае свае даныя для сувязі, і з ім звязваецца медыцынскі работнік, які запіша на зручны для пацыента час.

— Гэта значыць, не трэба сядзець у агульнай чарзе, а ёсць спецыяльныя кабінеты, якія будуць працаваць толькі па дыспансерызацыі?

— Так, у нашай паліклініцы, напрыклад, арганізаваны тры такія кабінеты, якія працуюць з 8 да 20. Складзены графік работы медыкаў, якія праводзяць дыспансерызацыю. Пры гэтым штатны расклад мы не павялічвалі, а за кошт сваіх рэзерваў арганізавалі работу трох кабінетаў у дзве змены. Дыспансерызацыю праводзяць урач агульнай практыкі, медыцынскія сёстры ці памочнікі ўрача па амбулаторна-паліклінічнай рабоце.

Рабочыя месцы абсталяваныя ў адпаведнасці з табелем аснашчэння кабінета ўрача агульнай практыкі. Там маецца растамер, вагі, сантыметровая стужка, прыбор для вымярэння ўнутрывочнага ціску, калькулятар індэкса масы цела, ЭКГ-апарат, каб правесці пацыенту дыспансерызацыю ў поўным аб'ёме і за адзін дзень.

Акрамя таго, на рабочым месцы камп'ютары падключаны да Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг для правядзення анкетавання. Медыцынскі работнік заходзіць, уводзіць усе даныя пацыента, яго мабільны тэлефон. Вынікі анкетавання, фактары рызыкі і ўсе неабходныя дыягнастычныя мерапрыемствы пацыент атрымае ў выглядзе СМС на свой мабільны тэлефон.

Дарэчы, тыя пацыенты, якія маюць лічбавы подпіс ці ID-картку, могуць прайсці анкетаванне самастойна дома. Яго вынікі прыйдуць у асабісты кабінет паліклінікі, дзе таксама спецыяльны медыцынскі работнік адсочвае гэтую інфармацыю. Ён звяжацца з гэтым чалавекам і запросіць у зручны для яго час у паліклініку для правядзення далейшых мерапрыемстваў па дыспансерызацыі.

— Менавіта на базе вашай паліклінікі праходзілі навучальныя семінары па дыспансерызацыі. Наколькі гатовы медработнікі праводзіць гэту працэдуру? Колькі яна зойме часу?

— Сапраўды на базе нашай паліклінікі праходзілі два пілотныя праекты па правядзенні дыспансерызацыі ў маі і снежні 2022 года. Гэта дазволіла асвоіць анкету, якая размешчана на сайце Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг, і праводзіць анкетаванне хутка і зразумелай для кожнага пацыента мовай, што скарачае час анкетавання. У сярэднім дыспансерызацыя доўжыцца з улікам вопыту правядзення анкетавання 15 хвілін. Самыя галоўныя тут — пытанні арганізацыі.

— Дыспансерызацыя — абавязковая працэдура для кожнага?

— Неабавязковая. Ад яе правядзення ў адпаведнасці з артыкулам 45 Закона «Аб ахове здароўя» можна адмовіцца. Медыцынская дыспансерызацыя праводзіцца ў рамках медыцынскай прафілактыкі, а тая, у сваю чаргу, з'яўляецца відам медыцынскай дапамогі. Таму пацыент мае права адмовіцца, але пры гэтым адмова мусіць быць аформлена ў адпаведнасці з заканадаўствам пісьмова.

Алена КРАВЕЦ.

ГРОШЫ Ў «РАЗРЭЗЕ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Літаральна падчас нашай сустрэчы супрацоўнік аддзела прынёс на праверку 100 еўра. Купюра паступіла ў адзін з гродзенскіх банкаў. У касіра ўзнікла сумненне ў сапраўднасці банкнота, былі выкліканы эксперты. Аказалася, што гэта падробка, прычым даволі якасная. Калі паглядзець на святло, бачны малюнак вадзянога знака. А імітаваная палоска — кініграма — свеціцца пры ўльтрафіялетавым даследаванні. І ўсё ж многія нюансы былі падробшчыкамі не ўлічаны.

Спецыялісты вызначаюць фальшыўку па спосабе друку і імітацыі элементаў абароны. Падробка грашовых білетаў можа быць поўнай альбо частковай. Судовы эксперт у галіне тэхнічнай экспертызы дакументаў павінен ведаць прыкметы кожнага спосабу падроблівання.

— Ва ўсіх грашовых білетах усіх краін свету, у тым ліку Беларусі, прымяняецца глыбокі металаграфічны друк — гэта вельмі дарагі спосаб, з дапамогай якога робяцца асноўныя выявы. Гэта нейкія рэльефныя асобныя дэталі, напрыклад каўнер палітычнага дзеяча на стадоларавай купюры. Каб атрымаць такі эфект, фарба кладзецца на паперу і нібы запячатваецца з абодвух бакоў. Плюс высокае разрознення, — зазначае Антон Ганенка. — Што датычыцца купюры ў 100 еўра, якую мы зараз разглядаем, тут адсутнічае рэльеф на арцы. У еўра арка павінна быць рэльефнай. Можна сказаць, што тут прымяняўся афсетны растрыраваны друк. Бывае, што падробкі імітуюць такі рэльеф цісненнем паперы ці нанясенне кропелек гелем.

Аналіз экспертнай практыкі паказвае, што больш за 90 працэнтаў падробленых грашовых білетаў выраблены капежна-струменевым спосабам друку, гэта значыць, на прынтары. Нягледзячы на відавочную падробку, яе могуць не заўважыць. Таму варта звяртаць увагу на наяўнасць вадзяных знакаў і абаронных нітак, якія бачныя на прасвет. Дзеля бяспекі эксперты раяць абменьваць банкноты толькі ў афіцыйных абменных пунктах і банках, а не набываць грашовыя купюры з рук.

У асноўным фальшывыя купюры паступаюць на экспертызу з пунктаў абмену валюты альбо непасрэдна з банкаў.

— Напрыклад, чалавек прынёс на абмен банкнот, а ён аказаўся падробленым. Кліента апытваюць і адпускаюць, а купюра паступае на экспертызу. Калі касір у банку памыліўся і купюра сапраўдная, орган папярэдняга расследавання вяртае яе кліенту. Калі гэта падробка, праводзіцца вельмі падрабязная экспертыза, пасля чаго даецца заключэнне аб усіх нюансах, якія не адпавядаюць сапраўдным банкнотам, — тлумачыць суразмоўца.

Па словах эксперта, падробкі становяцца ўсё больш дасканалымі. На фальшывых банкнотах імітуюцца вадзяныя знакі, ёсць палімерныя паласкі, прысутнічаюць спецыяльныя эфекты, напрыклад змена колеру, як у сапраўдных. Робіцца гэта не толькі на прынтарах, але і на высокатэхналагічным абсталяванні.

Задача экспертаў — ісці на крок наперадзе за падробшчыкаў.

— Мы сустракаліся з супрацоўніцай сакрэтнай службы ЗША, якая расказвала пра іх сродкі абароны. Аказалася, што яны ствараюць базу даных толькі падробленых грашовых білетаў ЗША, а мы — усіх валют, якія вымаюцца на тэрыторыі Беларусі. Што датычыцца якасці даследавання, то ў ЗША ва ўсіх выпадках правяраюцца папера, фарба і гэтак далей, — расказаў Антон Ганенка. — Таксама падчас сустрэчы быў азнаёмлены высокі ўзровень падрыхтоўкі беларускіх спецыялістаў. Добрая база ведаў даецца ў Акадэміі МУС, дзе рыхтуюць групу судовых экспертаў. Мы маем спецыяльнае абсталяванне высокага ўзроўню, ёсць вельмі высокатэхналагічныя апараты, напрыклад відэаспектральны кампаратар тыпа «Рэгула 4307» — гэта беларускі прыбор, які закупляюць многія краіны свету. Ён шматфункцыянальны, мае праграмнае забеспячэнне і дапамагае судоваму эксперту разгледзець любыя выпраўленні, нават самыя нязначныя.

Як правіла, друкуюцца фальшывыя грашовыя білеты за мяжой. Таму крыміналістамі вызначаецца яшчэ і ланцужок іх руху, што дае магчымасць следчым органам спыніць іх паток.

Самымі распаўсюджанымі падробкамі з'яўляюцца банкноты наміналам 100 долараў ЗША, больш рэдка — 50-грашовыя купюры. А вось еўра і расійскія рублі сярод фальшывак сустракаюцца нячаста. І зусім рэдка — беларускія рублі. Разам з тым можна сказаць, што за мінулы год колькасць падробак у параўнанні з папярэднім годам павялічылася. Згодна са статыстыкай Нацыянальнага банка Беларусі, за 9 месяцаў 2022 года выяўлена амаль на 20 працэнтаў больш падробленых грашовых білетаў у параўнанні з адпаведным перыядам папярэдняга года.

Суразмоўнік прыгадаў такі выпадак. Нядаўна з Польшчы вярнуліся гродзенцы, якія ездзілі туды працаваць. Там з імі разлічыліся, і яны вырашылі здаць валюту ў Гродне. Аказалася, што некалькі буйных купюр несапраўдныя. Пазней падробку выявілі яшчэ ў аднаго беларуса, які таксама там працаваў. Па яго словах, гэтымі банкнотамі разлічыўся прадпрымальнік — работадаўца. Органамі папярэдняга расследавання было вырашана зрабіць аналіз усіх астатніх купюр, каб упэўніцца, што больш няма падробак.

Ёсць факты, калі чалавек пры выяўленні фальшыўкі кажа, што набыў яе ў банку. Даказаць гэта наўрад ці магчыма. Таму падробку на сапраўдныя білеты не заменяць і грошы таксама за яе не вернуць.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

Кіно на выхадныя

ПРАЎДЗІВАЯ КАЗКА З ДОБРЫМ ФІНАЛАМ

Менавіта так гучыць другая версія назвы мастацкага фільма «Непапраўны лгун», які мы зможам убачыць у нядзелю 15 студзеня на тэлеканале «Беларусь 3». Кінастужка сёлета святкуе 50-годдзе, але, хоць камедыя рэжысёра Вілена Азарава даўно стала класікай, яе і сёння глядзіш з асаблівымі пачуццямі.

Фільм, у якім зняліся ў свой час Георгій Віцын, Эдзіта П'еха, Мікалай Парфёнаў і іншыя, распавядае на першы погляд простую гісторыю. Сюжэт камедыі прыхільнікі савецкай класікі і так згадаюць, аднак гэты аповед пра цырульніка Аляксея, што ўвесь час трапляе ў нейкія гісторыі, можа, і не меў бы такога поспеху ў аўдыторыі, калі б не па-майстэрску ўпляценыя сюды музычныя ўстаўкі, песні і нават танцы, а таксама выдатная ігра акцёраў.

Усе натурныя здымкі фільма праходзілі ў Маскве. Кажуць, што існуюць два варыянты фільма. І адрозненне іх не толькі ў агучванні, а і ў прысутнасці некаторых сцэн. Так, напрыклад, з-за цэнзуры зменшыўся экранны час героя Уладзіміра Этуша (прынц Бурухтаніі): асабліва моцна скарацілі эпізод пасадкі дрэва дружбы, а замест тытула «эмір» прынцу далі імя Эдгар... Увогуле кінастужка атрымалася лёгкая, дынамічная і пазітыўная. Згадаць сцэны, цікавыя дыялогі і ўбачыць любімых акцёраў будзе магчымасць падчас кінасеанса ў эфіры сацыякультурнага тэлеканала.

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 163

Сваю новую задачу прапануе мінчанін Міхаіл Кошаль (гл. дыяграму).

Белыя: Крa6, Фg8, Лf2, Лh3, Сf5, Kb7, Kd4, пп. a2, c3 (9).

Чорныя: Крc4, Сb4, пп. c2, c7, d5, f7 (6).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Задача Віктара Волчака (Беларусь) і Відадзі Заманава (Азербайджан) адзначана пахвальным водгукам на міжнародным конкурсе «А. Селіванаву — 55».

Белыя: Крa8, Фb5, Cd6, Ke5, Ke6, пп. f2, g2, g4 (8).

Чорныя: Крe4, Лb3, Лh6, Сc2, Ka5, Kg3, пп. b4, b6, c3, f6, g6, h7 (12).

Мат за 3 хады.

Рашае 1. Кc7! ~ 2. Фd5+ Крf4 3. Ke7x, 1...Крf4 2. K:g6+ Крe4 3. Фd5x, 2...Кр:g4 3. f3x, 1...fe 2. C:e5! ~ 3. Фd5x Блізня (Cd6 на b8): 1. Кc4! ~ 2. Kd6x, 1...Kf5 2. K:b6! ~ 3. Фd5x, 2...Kd4 3. Kc5x, 2...Ke3 3. f3x, 2...Ke7 3. Фe2x, 1...Kb7 2. Kd2+ cd 3. Фc4x, 1... Крd3 2. Kf4+

* * *

У мінулым выпуску мы распавялі пра турнір першай лігі чэмпіянату Беларусі сярод мужчын. У жанчын змагалася 31 удзельніца. Першае месца заняла Юлія Лявонава, на чыім рахунку 8 перамог і 1 нічыя. Другое месца ў Аляксандры Шабан (7 балаў), трэцяе — у Веранікі Абрамкінай (6,5). У вышэйшую лігу трапілі таксама Злата Данчанка і Маргарыта Бендзік (па 6 балаў).

Юлія Лявонава — Мілена Сідарэня. 1. c4 e6 2. Kc3 d5 3. d4 c6 4. Cf4 dc 5. a4 Cb4 6. e3 Kf6 7. C:c4 Kd5 8. Kge2 K:f4 9. K:f4 0-0 10. 0-0 Kd7 11. Ke4 e5 12. Kd3 Фe7 13. Фh5 h6 14. de Kb6 15. Kf6+ Kph8 16. Cb3 a5 17. Kf4 Kd7 18. Kg4 Фg5 19. C:f7 Ф:h5 20. C:h5 Крg8 21. e6 Kf6 22. Cf7+ Kph7 23. K:f6+ gf 24. Лfd1 b6 25. Лac1 Ca6 26. Лd7 Лfd8 27. Лcd1 Ce7 28. Kg6, 1:0.

Вікторыя Дорашава — Веранікa Абрамкіна. 1. d4 d5 2. c4 dc 3. Kf3 Kf6 4. e3 b5 5. a4 b4 6. C:c4 e6 7. 0-0 Cb7 8. Kbd2 Ce7 9. b3 0-0 10. Cb2 Kbd7 11. Ke5 c5 12. Kdf3 cd 13. C:d4 Kd5 14. K:d7 Ф:d7 15. Ke5 Фd6 16. Фh5 Cf6 17. f4 g6 18. Фh6 Cg7 19. Фh4 Ke7 20. Лad1 Kf5 21. Фh3 Лfd8 22. Ce2 K:d4 23. ed Лac8 24. Cc4 Cd5 25. Крh1 Фb6 26. Ce2 Лc3 27. Лd3 Лdc8 28. Л:c3 Л:c3 29. Фh4 Фc7 30. Cb5 Лc2 31. Kf3 C:b3 32. Kg5 h6 33. Ke4 Cc4, 0:1.

* * *

Беларуская федэрацыя шахмат шляхам апытання вызначыла лаўрэатаў 2022 года: шахматыста (Дзяніс Лазавік), шахматыстку (Ніка Венская), трэнера (Сімяон Мерыбанаў), турнір (міжнародны «Мінск») і рэгіён (горад Мінск).

* * *

У Алматы (Казахстан) прайшлі чэмпіянаты свету па хуткіх шахматах і бліцы. З беларускіх шахматыстаў найлепшы вынік паказаў Дзяніс Лазавік — 16-е месца ў бліцы і 42-е ў хуткіх шахматах. Вольга Бадзялка, якая цяпер выступае за Расію, фінішавала ў бліцы восьмая.

У міжнародным турніры ў Оршы з удзелам 10 шахматыстаў з Беларусі, Расіі і Арменіі (у тым ліку трох гросмайстраў, аднаго міжнароднага майстра і шасці майстроў ФІДЭ) першае і другое месцы занялі адпаведна расійскія майстры ФІДЭ Ілья Грыгор'еў і Арцём Ускоў. 3-4 месцы падзялілі беларускія гросмайстры Андрэй Кавалёў і Аляксей Аляксандраў, а іх калега Кірыл Ступак заняў 5-е месца.

На бліцтурніры ў Мінску (54 удзельнікі) прызавую тройку склалі Аляксей Краміч, майстры ФІДЭ Арцём Стрыбук і Арцём Сіняўскі.

На Мемарыяле Л. Заменгофа ў Беластоку Сяргей Азараў і Аляксей Грыгаровіч заваявалі «бронзу» адпаведна ў турнірах «А» і «Б».

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. Фе7! Правільна адказалі Васіль Жуковіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

Вадзім ЖЫЛКО.

Сядзі і глядзі

ЁСЦЬ НАГОДЫ ДЛЯ НОВАЙ СУСТРЭЧЫ

У тэлеэфіры працягваюць згадваць і дарыць спатканні з любімымі артыстамі, паказваючы фільмы і праграмы з іх удзелам і адкрываючы новыя старонкі іх біяграфій. Бліжэйшыя выхадныя не стануць выключэннем.

На «Беларусь 3» з нагоды 60-годдзя з дня нараджэння расійскай актрысы тэатра і кіно Ганны Самохінай (1963—2010) пакажуць мастацкі фільм «Вязень замка Іф» (1988). У ім артыстка знялася ў ролі Мерседэс. Прыгодніцкая драма з удзелам Міхаіла Баярскага, Ігара Скляра, Аляксея Пятрэнкі і іншых пераносіць у час дзеяння рамана Аляксандра Дзюма «Граф Монтэ-Крыста», які стаў асновай для будучай кінаработы. А значыць, нас чакае вялікая гісторыя пра каханне, здраду, сяброўства і ўменне пераадольваць любыя выццёвыя выпрабаванні. Але заўсёды галоўнае пры гэтым — не страціць сябе і вернасць ўласным перакананням. Гэтая відовішчная рамантычная гісторыя дакладна нагадвае пра тое, што ўсё магчыма для людзей, калі яны дзейнічаюць.

А калі цікавяць падрабязнасці біяграфіі актрысы Ганны Самохінай, то можна на тэлеканале АНТ 14 студзеня паглядзець дакументальны фільм «Запомніце мяне маладой і прыгожай». Пра яе, вытанчаную прыгажуню, загаварылі пасля кінафільмаў «Вязень замка Іф», «Злодзеі ў законе». Мужчыны вар'яцелі ад яе прыгажосці. Артыстка пайшла з жыцця пасля цяжкой хваробы ва ўзросце 47 гадоў, што стала для ўсіх нечаканасцю. У дакументальным фільме аўтары паспрабуюць даследаваць, у якіх адносінах была актрыса са сваім калегам Арнісам Ліціцісам, што падарвала яе здароўе і як дзяцінства паўплывала на асобу будучай кіназоркі савецкага экрана. Ганна ўвесь час працавала над сабой, імкнулася да дасканаласці і дзякуючы гэтаму стала адной з самых яркіх і прыгожых актрыс. Але менавіта гэта і сыграла з ёй злы жарт, пакалькі многія рэжысёры бачылі ў артыстцы толькі яе харызму і прывабнасць, таму і ролі прапаноўвалі адпаведныя. І ў асабістым жыцці яна тройчы спрабавала знайсці ўласнае шчасце, аднак усё дарэмна. Ганна Самохіна свае апошнія дні правяла ў бальніцы, але нават і там да апошняга імкнулася заставацца сапраўднай жанчынай. Усе падрабязнасці яе жыцця чакаюць нас у фільме.

